Перавозкі грузу самалётам – адзін з ключавых напрамкаў нашай дзейнасці. Для работы ў гэтым напрамку намі створана каманда кваліфікаваных спецыялістаў.
Мы маем наладжаныя дзелавыя кантакты з авіякампаніямі, а таксама з сусветнымі агентамі, што дае магчымасць ажыццяўляць авіяперавозкі практычна ў любы аэрапорт свету, а таксама на любых умовах, уключаючы door-to-door.

## Аказваем паслугі:

***Афармленне дакументаў:***

- папярэдняе браніраванне грузу;
- афармленне грузавой авіянакладной (AWB, HAWB);
- дэкларыраванне і мытнае афармленне.

***Кантроль руху грузу:***

- адсочванне руху тавару (tracking);
- аператыўнае інфармаванне кліента аб статусе грузу;

***Дадатковыя паслугі:***

- страхаванне;
- кансультацыйныя паслугі;
- мытная ачыстка / транзіт;
- кансалідацыя / раскансалідацыя;
- захоўванне на СЧЗ і мытным складзе.

**Магчымасць перавозкі небяспечных грузаў:** спецыялісты транспартна-лагістычнага цэнтра маюць міжнародныя сертыфікаты IATA па авіяперавозках небяспечных грузаў.

## Карысная інфармацыя:

**Габарыты грузаў:**

Дзякуючы сучаснай тэхнічнай аснашчанасці ТЛЦ РУП «Нацыянальны аэрапорт Мінск» мае магчымасць апрацоўкі грузаў паветраных суднаў да 7 тон адно месца і апрацоўкі цяжкавагавых грузаў, якія прыбываюць наземным транспартам, звыш 8 тон.
Пры адпраўцы цяжкавагавых грузаў неабходна папярэдняе ўзгадненне па ўдакладненні габарытных параметраў.

**Як адправіць груз:**

Для таго, каб адправіць груз, неабходна запоўніць заяўку на адпраўку грузу або звязацца з нашым спецыялістам.

**Як разлічыць кошт перавозкі:**

Кошт перавозкі грузаў залежыць ад характару грузу, вагі, маршруту палёту, тэрміновасці і г.д. Як правіла, кошт перавозкі можна падлічыць наступным чынам:

кошт = тарыф за 1 кг платнай вагі* х колькасць у кг + дадатковыя зборы (збор за бяспеку, паліўны збор, збор за афармленне авіянакладной, спецыяльныя зборы).

* платная вага – вага брута або аб'ёмная вага ў залежнасці ад таго, якая з іх большая. Аб'ёмная вага вылічваецца па правілах IATA 1:6, гэта значыць груз аб'ёмам 1 кубічны метр аплачваецца не менш чым за 167 кг)